БИБЛИОТЕКА
БГУ

www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

28 лістапада 2008 года, № 19 (1991)

СУСТРЭЧЫ

## БУДЗЕМ ЗНАЁМЫЯ!

***Новы кіраўнік БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА з першых дзён працы на пасадзе рэктара пачаў інтэнсіўна знаёміцца не толькі з агульным становішчам спраў, але і асабіста сустракаючыся з супрацоўнікамі і студэнтамі універсітэта.***

Адным з першых крокаў рэктара стала сустрэча са студэнцкім актывам, якая адбылася 5 лістапада з удзелам прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава, начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Паўла Скалабана і супрацоўнікаў УВРМ. Сяргей Абламейка пазнаёміўся з лідарамі моладзевых арганізацый БДУ, якія расказалі пра сваю працу і планы, падзяліліся праблемамі, выказалі спадзяванне на працяг плённага супрацоўніцтва з кіраўніцтвам запрасілі на будучыя мерапрыемствы.

У сваю чаргу, Сяргей Уладзіміравіч распавёў пра сябе, пра ролю універсітэта ў сваім жыцці, падзяліўся бачаннем далейшага развіцця БДУ, а таксама ролі арганаў студэнцкага самакіравання ў раскрыцці патэнцыялу моладзі.

Прыязнасць рэктара, яго ўважлівасць да студэнцкіх меркаванняў і шчырасць у размове вельмі спадабаліся ўдзельнікам сустрэчы (яна цягнулася, дарэчы, болей за дзве гадзіны).

Такая ж зычлівая атмасфера панавала і падчас гутарак Сяргея Абламейкі з жыхарамі студэнцкіх інтэрнатаў. На сустрэчы 10 лістапада ў "пяцёрцы" ўдзельнічала каля трохсот пяцідзесяці чалавек. Студэнты задавалі самыя розныя пытанні: пра першыя дзеянні і намеры новага рэктара, пра лёс насельнікаў чацвёртага і пятага інтэрнатаў, пра сістэму адукацыі ў цэлым і нават пра 5-дзённы вучэбны тыдзень. А 11 лістапада ў канферэнц-зале "двойкі" была зладжана прэзентацыя арганізацый актыву Студгарадка.



Сяргей Абламейка гутарыць з моладзевымі лідарамі

Абагульняючы пачутае на згаданых сустрэчах, мы вылучылі тры асноўныя моманты, якія, на нашу думку, даюць уяўленне пра новага кіраўніка БДУ.

### Асабістае

Сяргей Уладзіміравіч не па чутках ведае Белдзяржуніверсітэт, бо з'яўляецца выпускніком менавіта нашай ВНУ. У 1973 г. юны абітурыент Сяргей Абламейка з мястэчка Воранава Гродненскай вобласці насуперак бацькоўскай волі, якія "сваталі" яго ў Гродненскі педагагічны інстытут, вырашыў паспрабаваць узяць высокую планку і паступіць на механіка-матэматычны факультэт БДУ. І гэта нягледзячы на тое, што дзяўчат у педагагічным, па словах самога Сяргея Уладзіміравіча, было значна больш. Бацькам ён заявіў каротка: "Хачу ў БДУ". Прыйшлося шукаць жыллё ў Мінску, тэрмінова рыхтавацца да паступлення. Аднак, нераадлеўшы ўсе складанасці, ён здаў уступныя выпрабаванні і на "выдатна" першую і другую сесіі. Нават жыццё ў інтэрнаце з другога курса не адбілася на яго паспяховасці: сярэдні бал за перыяд навучання на мехмаце склаў 4,7 (па пяцібальнай сістэме!).

Пасля заканчэння універсітэта лёс трывала звязаў прафесійную дзейнасць Сяргея Уладзіміравіча з Інстытутам тэхнічнай кібернетыкі Нацыянальнай акадэміі навук (з 2002 года – Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН Беларусі). Стажор-даследчык, аспірант, навуковы супрацоўнік – за 30 гадоў Сяргей Абламейка прайшоў усе прыступкі навуковага і кар'ернага росту, аж да генеральнага дырэктара АІПІ. Ён быў звязаны са шматлікімі вядомымі высокатэхналагічнымі праектамі, распрацоўкай беларускіх суперкампутараў, якія ўвайшлі ў сусветны рэйтынг. Прысутнічаў на касмадроме "Байканур" пры спробе вывесці на арбіту першы беларускі спадарожнік. "Выбух расійскага ракетаносьбіта стаў сапраўдным узрушэннем і дагэтуль стаіць перад вачыма", – не хавае расчаравання Сяргей Уладзіміравіч.

*Кіраваць вядучым універсітэтам краіны, умацоўваць і працягваць яго славутыя традыцыі для таго, хто заўсёды быў неабыякавы да лёсу БДУ, не толькі адказна, але і вельмі пачэсна.*

Да ўсяго, Сяргей Абламейка павышаў сваю навуковую кваліфікацыю на стажыроўках у Італіі, Японіі, Германіі, Швецыі, Іспаніі і іншых краінах.



На сустрэчы з актывістамі Студэнцкага гарадка

Аднак, нягледзячы на кіпучую навуковую і бурлівую кіраўнічую дзейнасць, ён ніколі не пакідаў родную альма-матэр па-за ўвагай: сустрэчы з аднакурснікамі, выкладанне на кафедры матэматычнага забеспячэння АСУ факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі; сумесныя з вучонымі БДУ праекты. Месца вучобы дачкі – таксама Белдзяржуніверсітэт.

Менавіта таму Сяргей Уладзіміравіч лічыць, што кіраваць вядучым універсітэтам краіны, умацоўваць і працягваць яго славутыя традыцыі для таго, хто заўсёды быў неабыякавы да лёсу БДУ, не толькі адказна, але і вельмі пачэсна.

### Развіццё універсітэта

Падчас сустрэч рэктар адзначыў некаторыя з асноўных стратэгічных кірункаў развіцця універсітэта, якое, па яго словах, мусіць быць планамерным, узважаным, прапарцыйным і збалансаваным. Новае не павінна асуджаць на страту традыцый, дасягненняў, завяяваных працай шматлікіх пакаленняў.

Ключавымі момантамі з'яўляюцца павышэнне якасці адукацыйнай, навукова-даследчай, арганізацыйна-кіраўнічай і выхаваўчай дзейнасці, умацаванне аўтарытэту БДУ як вядучай ВНУ краіны. На думку Сяргея Абламейкі, больш цеснае супрацоўніцтва навукі і адукацыі ў рамках універсітэта, вырашэнне сумесна з НАН Беларусі навуковых і практычных задач для ўсіх галін народнай гаспадаркі краіны паслужыць узмацненню інвестыцыйнай прывабнасці БДУ і яго інтэграцыі ў сусветную адукацыйную і навуковую прастору.

Рэктар з энтузіязмам падтрымаў студэнцкую ідэю "маркетынгу БДУ", прасоўвання універсітэта як своеасаблівай маркі, фарміравання яго цэласнага іміджу, сістэмы карпаратыўных каштоўнасцяў і традыцый.

### Моладзевая палітыка

У сваіх выступленнях Сяргей Уладзіміравіч не раз падкрэсліваў важнасць студэнцтва ў жыцці дзяржавы, і асабліва актыўных студэнтаў, якія ў далейшым змогуць вывесці Беларусь на якасна новы ўзровень развіцця. "Моладзь – гэта галоўнае", – менавіта гэтая думка была асноўнай у выказваннях рэктара.

Універсітэцкае жыццё шматстайнае, яно заключаецца не толькі ў атрыманні пэўных ведаў і ўменняў, неабходных для паспяховай прафесійнай дзейнасці, але таксама ў набыцці сяброў, калегаў і жыццёвых арыенціраў, якія спрыяюць інтэграцыі маладога чалавека ў соцыум, яго ўспрыманню грамадскіх каштоўнасцяў і ідэалаў.

У сувязі з гэтым рэктар падкрэсліў асаблівую значнасць органаў студэнцкага самакіравання для раскрыцця творчага патэнцыялу студэнтаў, гарманічнага развіцця асобы, фарміравання лідарскіх якасцяў і кіраўнічых навыкаў, назапашвання вопыту арганізатарскай працы. Сяргей Уладзіміравіч пажадаў дзейным студэнтам заўсёды быць такімі ж мэтанакіраванымі, скарыстоўваць свае магчымасці, жыць цікава і актыўна; запэўніў у падтрымцы ўсіх добрых пачынанняў.

**Ганна ХОЛАД,
Аляксей ЮРКЕВІЧ**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ДЫГІТАЛІЗАЦЫЯ: ЦТ БЕЗ СТРЭСУ**

Гутарка з доктарам эканамічных навук Міхаілам КАВАЛЁВЫМ пра новыя тэхналогіі ў адукацыйным працэсе

**Стар. 2**

**СТУДЭНТ ГОДА БДУ-2008**

Падведзены вынікі штогадовага конкурсу маладых талентаў

**Стар. 3**

**СВЕЖАНЬКАЯ КАПУСТА**

Чарговая феерыя першакурснікаў на "Капусніку"!

**Стар. 4**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПЕРСПЕКТЫВЫ супрацоўніцтва паміж БДУ, Тэгеранскім універсітэтам, Нацыянальнай бібліятэкай і іншымі ўстановамі культуры і адукацыі Ірана абмеркаваны на сустрэчы рэктара БДУ прафесара Сяргея Абламейкі, дарадцы прэзідэнта Ірана па культуры і адукацыі Аліагбара Ашары і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Ірана ў Беларусі Сееда Абдалы Хасейні. Сустрэча адбылася 21 лістапада ў Белдзяржуніверсітэце.

РЭКТАР БДУ прафесар Сяргей Абламейка 20 лістапада сустрэўся з прарэктарам Венскага тэхнічнага універсітэта Хансам Карлам Кайзерам. Былі абмеркаваны шляхі далейшага супрацоўніцтва ў адпаведнасці з існуючым пагадненнем паміж дзвюма ВНУ.

ВЫНІКІ сёлетняй уступнай кампаніі ў ВНУ і планы на наступны год абмеркаваны 27 лістапада на калегіі Міністэрства адукацыі.

СІСТЭМА менеджменту якасці адукацыі павінна пачаць дзейнічаць у БДУ да канца 2009 года. Такое рашэнне прынята на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ. У адпаведнасці з гэтым дакументам, загадам рэктара Белдзяржуніверсітэта Сяргея Абламейкі ў БДУ створаны Савет па каардынацыі кіравання якасцю вышэйшай адукацыі і намечаны шэраг іншых мерапрыемстваў. Больш падрабязныя матэрыялы на гэту тэму будуць надрукаваны ў наступных нумарах газеты "Універсітэт".

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

# Дыгіталізацыя: ЦТ без стрэсу

***Электронныя студэнцкія білеты, якія даюць доступ у Інтэрнэт; школьныя дзённікі, у якія бацькі могуць зазірнуць он-лайн у момант выстаўлення адзнакі; цэнтралізаванае тэсціраванне, вынікі якога падводзіць кампутар; медыятэкі, дзе можна знайсці лекцыі і ВМК у электронным выглядзе... Навучальны працэс мяняецца пад уплывам новых тэхналогій, і сённяшні студэнт, узброены мудрагелістымі гаджэтамі, недаверліва ўсміхаецца, калі чуе, быццам інфармацыю калісь перапісвалі ад рукі з бібліятэчных кніг. Пра дыгіталізацыю адукацыйнай сістэмы мы пагаварылі з дэканам эканамічнага факультэта, доктарам фізіка-матэматычных навук і заслужаным дзеячам навукі Беларусі Міхаілам КАВАЛЁВЫМ, сапраўдным генератарам наватарскіх ідэй.***



**– Міхаіл Міхайлавіч, якія электронныя тэхналогіі аблягчаюць жыццё выкладчыкаў БДУ?**

– У нас існуе электронная база даных студэнтаў. Націснуўшы літаральна дзве кнопкі, я магу вокамгненна адшукаць звесткі пра любога студэнта, паглядзець, з якім балам ён паступаў да мяне на факультэт, якімі льготамі карыстаўся пры паступленні, колькі разоў перадаваў той ці іншы прадмет, якая стыпендыя яму налічалася і калі. Прытым усю гэтую інфармацыю магу атрымаць з дапамогаю мабільнага тэлефона праз Інтэрнэт, знаходзячыся, скажам, на лецішчы.

Нам патрэбны электронны расклад заняткаў, адзіны для ўсіх факультэтаў і даступны ў Інтэрнэце. Тыя расклады, што вісяць на калідорах навучальных устаноў, безнадзейна састарэлі, як, дарэчы, і традыцыйныя залікоўкі, ведамасці... У Мінскім інстытуце кіравання даўно ўжо няма папяровых залікоўак, думаю, і ў БДУ неўзабаве з'явіцца электронная, у выглядзе чыпавай карты, куды будуць заносіцца ўсе адзнакі. У Еўропе (дзе не было залікоўак увогуле, а пасля кожнага іспыта выдавалася штосьці накшталт даведкі) зараз распрацоўваецца электронная залікоўка "Эўрапас", адзіная для ўсіх ВНУ, што падпісалі Балонскую дэкларацыю.

**– Дзе яшчэ дапамогуць лічбавыя тэхналогіі?**

– БДУ павінен падаць прыклад электроннага дакументазвароту. У нас сабраны інтэлектуальны патэнцыял краіны, мы рыхтуем сотні праграмістаў для фірмаў – каму як не нам паказаць, як можа быць наладжана праца ў XXI стагоддзі? У БДУ ствараецца уніфікаваная сістэма ўліку кантрактаў і аплат, якая вызваліць ад папяровай валакіты, запаўнення стосу дакументаў і афармлення дагавораў: залічаны абітурыент (альбо ягоныя бацькі) змогуць заключыць кантракт, не выходзячы з дому. Інфармацыя пра тое, ці заплаціў студэнт за навучанне, мусіць аўтаматычна прыходзіць ва універсітэт з банка.

Паміж ВНУ розніца невялікая, мы ўсе працуем, зыходзячы з адной метадалагічнай базы, дык мае сэнс зрабіць тыпавую праграму электроннага дакументазвароту, якая ахапіла б усе вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, а то кожны універсітэт па-свойму арганізоўвае дзейнасць бухгалтэрыі, дэканата...

Але самае галоўнае, што хацелася б пабачыць у новым годзе, – гэта адзіную базу даных размеркавання абітурыентаў па ВНУ. Яна магла б працаваць наступным чынам: абітурыент знаёміцца з рэйтынгамі ВНУ і выбірае некалькі факультэтаў, далей кампутарная сістэма апрацоўвае пададзеныя заяўкі і паведамляе на яго электронную пошту ці мабільны тэлефон, што з такімі баламі ён можа быць залічаны, напрыклад, толькі на платную форму навучання пэўнай установы. Або на бюджэт на ўсе запрошаныя ім спецыяльнасці. Абітурыенту застаецца толькі пацвердзіць сваю заяўку ў канкрэтную ВНУ. І не трэба падаваць дакументы, забіраць дакументы, хвалявацца, што не паспееш перавесці іх у іншы інстытут. Нават медыцынскую даведку не трэба будзе прад'яўляць, бо ў гэтую самую базу даных паліклінікі дашлюць адпаведныя звесткі – гэта, праўда, наўрад ці пабачым у наступным годзе, але ў межах праекта "Электронная Беларусь" прадугледжаны і перавод медыцынскіх устаноў на лічбавыя тэхналогіі. Усё гэта пазбавіць дзяцей лішніх турбот, стаяння ў чэргах, бегатні па ВНУ.



**– Але застаецца галоўны "фактар стрэсаў" – цэнтралізаванае тэсціраванне...**

– Вынікі ЦТ ужо сёння захоўваюцца ў электронным выглядзе, таму перайсці да адзінай сістэмы залічэння даволі проста. Застаецца пазбавіцца чэргаў, каб абітурыент не стаяў па выпіскі вынікаў тэсціравання, а зайшоў у базу даных размеркавання па ВНУ і ацаніў свае шанцы. Пажадана ўвесці кампутарнае тэсціраванне. Напрыклад, у Маскве тэст TOEFL можна здаваць на папяровых носьбітах, а можна – у адпаведным кампутарным цэнтры. Каб было бачна, што здаяце тэст вы, а не хтосьці за вас, такі цэнтр мусіць быць адмыслова абсталяваны – вы перад здачай тэста пакажаце пашпарт відэакамеры, яна ж будзе сачыць за парадкам пры выкананні заданняў, каб не было пабочных людзей і каб ніхто не спісваў. Варта дазволіць здаваць ЦТ не толькі ў пэўны тыдзень, што правакуе істэрыю. У апісаны кампутарны цэнтр абітурыент зможа прыйсці ў любы зручны для яго дзень і праз суткі даведацца пра вынікі. Колькасць варыянтаў тэста трэба павялічыць: уся школьная праграма па пэўным прадмеце разбіваецца на, скажам, 50 тэм, якія загадзя аб'яўляюцца школьнікам, і па кожнай тэме ствараецца сто раўназначных варыянтаў тэста. Калі вы рэгіструецеся здаваць тэст, вам праграма выпадковым чынам генеруе адзін з пяцідзесяці ў сотай ступені варыянтаў. Такую колькасць тэстаў немагчыма запомніць, значыць, іх можна апублікоўваць і даваць школьнікам на працягу года, што зноў жа паменшыць страх перад ЦТ. Увогуле, дыгіталізацыя, беспаперовыя тэхналогіі даваліся сёння поўнасцю аўтаматызаваць працэс тэсціравання, захоўвання вынікаў тэстаў і далейшага размеркавання абітурыентаў па ВНУ ў адпаведнасці з гэтымі вынікамі. Каб падрыхтаваць патрэбныя кампутарныя сістэмы, інтэлектуальнага патэнцыялу ў беларускіх кампутарных фірмаў хапае.

**– Кампутарнае тэсціраванне можна прымяніць і для кантролю ведаў студэнтаў?**

– На кожным факультэце ў нас сядзяць метадысты, існуюць аддзелы кантролю якасці ведаў: людзі ходзяць і правяраюць, ці ў правільных папках ляжаць правільныя паперы, арганізоўваюць кантрольныя "зрэзы" ведаў – замест гэтага трэба зрабіць на кожнай тыпавой навучальнай праграме банк кантрольных тэстаў. Між іншым, у БДУ для тэсціравання і праверкі ведаў створана сістэма "e-University" – гэта, у прынцыпе, тое, што нам трэба, час напаўняць яе велізарнай колькасцю тэстаў.

**Гутарыла Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**фота Юліі ПАПОВАЙ**

## ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

*Чым выклікана павышэнне платы за навучанне ў БДУ з лістапада гэтага года?*

Як паведамілі ў Галоўным упраўленні планавання, бухгалтарскага ўліку і фінансаў, павышэнне кошту платнага навучання ў БДУ з'яўляецца аб'ектыўным працэсам, які адбываецца ва ўсіх ВНУ краіны, і звязана, у першую чаргу, са зменай памеру тарыфнай стаўкі першага разраду для аплаты працы работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту. Як вядома, з 1 лістапада 2008 г. гэта стаўка Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 5.10.2008 г. павышаная на 24,66 %. Адпаведна ўвядзеныя і карэкцыйныя каэфіцыенты да іншых тарыфных ставак (акладаў) работнікаў арганізацый і ўстаноў. Белдзяржуніверсітэт у кастрычніку гэтага года выканаў усе неабходныя разлікі і на пачатку лістапада ўзгадніў новыя кошты на платнае навучанне з Міністэрствам адукацыі.

Рост тарыфных ставак, змена карэкцыйных каэфіцыентаў і парадку фарміравання фонду заработнай платы ў сукупнасці прывялі да павышэння заработнай платы прафесарска-выкладчыцкага складу і абслуговага персаналу ў сярэднім на 28,5 %.

Аднак рост заработнай платы не з'яўляецца адзінай прычынай павышэння платы за навучанне. Таксама ўплывае павелічэнне выдаткаў на гаспадарчыя патрэбы па ўтрыманні ВНУ і камунальныя паслугі, але ў БДУ вырашана гэта павелічэнне не ўлічваць пры павышэнні платы за навучанне і нават пайсці на зніжэнне прыбытку ад адукацыйных паслуг на тых спецыяльнасцях, рэнтабельнасць якіх перавышае 15 %. Да слова, ва універсітэце з рэнтабельнасцю ад 10 да 15 % на платнай аснове навучаецца 16,4 % студэнтаў, ад 5 да 10 % – 8,4 %, да 5 % – 38,3 %.

Патлумачым на прыкладзе суадносіны кошту навучання і прыбытку БДУ. Калі *базавы* кошт навучання 1 студэнта за год прыняць за 3 млн. руб., то пры ўзроўні рэнтабельнасці ў 15 % гэта лічба павялічыцца на 450 тыс. руб., а пры ўзроўні рэнтабельнасці 5 % – на 150 тыс. руб. за год. Гэтыя грошы і ёсць рэальны даход, які таксама ідзе на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта: закупку абсталявання, тэхнічных сродкаў навучання, капітальнае будаўніцтва, рамонт і іншыя паслугі.

Дарэчы, усталяваны памер рэнтабельнасці навучання па галіне адукацыі складае 30 %.

У выніку прынятых захадаў кошт навучання ў БДУ вырас у сярэднім *толькі* на 22,7 %, у тым ліку для студэнтаў дзённай формы – на 21,8 %.

Кіраўніцтва БДУ збіраецца і надалей рабіць усё, што ад яго залежыць, каб мінімізаваць павышэнне платы за навучанне. Пры гэтым варта адзначыць, што дзяржава па-ранейшаму нясе асноўны цяжар выдаткаў на адукацыю. У БДУ, напрыклад, студэнты-платнікі аплочваюць троху больш за палову рэальнага кошту свайго навучання.

## УРАЧЫСТАСЦІ

# НАВУКА І ІНАВАЦЫІ

***У БДУ 20-21 лістапада прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Вузаўская навука: стан і перспектывы", прысвечаная 45-годдзю НДЧ-ГУН.***

Мэтай канферэнцыі з'яўлялася асвятленне сучаснага стану і патрабаванняў да навуковай дзейнасці, суадносіны фундаментальных і прыкладных даследаванняў, іх узаемасувязь з сістэмай падрыхтоўкі кадраў, суадносіны вузаўскага і акадэмічнага складніка ў навуковай сферы. У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 100 чалавек.

Адкрыў канферэнцыю пад гукі гімна БДУ рэктар, член-карэспандэнт НАН Беларусі прафесар Сяргей Абламейка. Пра дзяржаўную палітыку ў сферы навуковай і інавацыйнай дзейнасці распавёў першы намеснік старшыні ДКНТ У. Нядзілька. Тэму далей развіў прарэктар па навуковай працы БДУ У. Панькоў. Сярод дакладчыкаў былі акадэмік (загадчык кафедры БДУ) А. Лесніковіч, члены-карэспандэнты НАН Беларусі У. Піліпенка (нам. дырэктара ДЦ "Белмікрааналіз" НВА "Інтэграл"), Ю. Харын (дырэктар НДІ ППМІ БДУ) і А. Івашкевіч (дырэктар НДІ ФХП БДУ). У прыватнасці, А. Івашкевіч асвятліў пытанні ўзаемадзеяння вузаўскай навукі і прамысловасці. Гэтую ж праблему закрануў дырэктар Беларускага інавацыйнага фонду А. Грышановіч. Пра магчымасці еўрапейскага навуковага супрацоўніцтва гаварыла кіраўнік Нацыянальнага інфармацыйнага офіса 7-й Рамачнай праграмы навуковых даследаванняў і тэхналагічнага развіцця ЕС В. Меяроўская. Пра перспектывы ўкраінска-беларускага супрацоўніцтва ў галіне прыродазнаўчых навук распавёў загадчык аддзела Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Украіны прафесар Я. Мазурэнка. У выступленнях прадстаўнікоў вядучых ВНУ і НДІ былі закранутыя пытанні аховы інтэлектуальнай уласнасці, асаблівасці арганізацыі навуковай і інавацыйнай дзейнасці, навукова-даследчай працы студэнтаў і падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

**Таццяна ДЗІК,**
**начальнік НДЧ-ГУН**


## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** руская літаратуры, замежнай журналістыкі і літаратуры, гісторыі журналістыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі, перыядычнага друку, сацыялогіі журналістыкі;

**ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ** тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі, рускай літаратуры;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** крыніцазнаўства, фізічнага выхавання і спорту, агульнага землязнаўства.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.*

**ДУА "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**
**запрашае на павышэнне кваліфікацыі ў студзені-сакавіку 2009 г. па наступных накірунках:**

*Англійская мова як сацыяльная і прафесійная кампетэнцыя сучаснага спецыяліста* (для прафесарска-выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) 12.01-20.03 (2 разы на тыдзень)

*Школа маладога спецыяліста: адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні прыродазнаўча-навуковых дысцыплін* (для выкладчыкаў ВНУ) 19.01-23.01

*Нарматыўна-прававыя і метадычныя асновы рэалізацыі адукацыйных стандартаў новага пакалення* (для прафесарска-выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) 19.01-23.01

*Адрас: г. Мінск, вул. Маскоўская, 15, аддзел кадраў, каб. 215, тэл. 200-91-07.*

ВІНШУЕМ!

# СКАРБОНКА АЛЬМА-МАТЭР

***Падведзены вынікі конкурсу “Студэнт года БДУ-2008”. Наш карэспандэнт радавалася перспектывам, што чакаюць пераможцаў.***



*Шчаслівыя пераможцы з аптымізмам глядзяць у будучыню*

Студэнты – унікальныя людзі, гатовыя працаваць плённа ды на голым энтузіязме. Пазней яны сталеюць, страчваюць рамантычны флёр і пачынаюць аддаваць перавагу меркантыльным інтарэсам. І гэта натуральна, бо трэба калісь станавіцца на ногі і шукаць сабе месца пад сонцам. Дыплом вядучай ВНУ – добрая падмога. Калі ж да яго прыкладаюцца задакументаваныя дасягненні (не толькі па вучобе), тады атрымліваюцца не проста кваліфікаваныя маладыя спецыялісты, а са знакам якасці. Такія людзі – штучны тавар на рынку працы. І яны гэта ведаюць. Навучыцца сябе цаніць ім дапамагае родная ВНУ.

У БДУ найлепшых студэнтаў штогод вылучаюць і падтрымліваюць: маральна (дыпломамі і віншаваннямі на Вучоным савеце) і матэрыяльна – грашовымі прэміямі. Сёлета гэта па 500 тыс. руб. пераможцам конкурсу (іх цяпер 7), і па 100 тыс. руб. – лаўрэатам (іх 14). Амаль пяць мільёнаў для таленавітай моладзі БДУ.

Прэтэндэнты на званне Студэнта года мусяць прайсці адбор экспертнай камісіі ў складзе 13 чалавек. Прыкладам, можаш хоць некалькі медалёў з сусветных спаборніцтваў прывезці, але не паспець атрымаць пару залікаў і сапсаваць пра сябе ўражанне. Крытэрыі адбору – не толькі колькасць узнагарод, але і паспяховасць у асноўнай дзейнасці, вучобе. Па словах арганізатараў конкурсу, у гэтым годзе хапала моцных кандыдатаў. Нават атрымалася, што ў трох традыцыйных намінацыях: “Навука”, “Спорт” і “Лідар” – ажно па два пераможцы.

Будучым працадаўцам трэба звярнуць увагу на наступных асоб, якія заслугоўваюць адпаведны вялікім уменням заробак і кар’ерны рост:

*“навукоўцы”* – пяцікурсніца ФМА Настасся ТРАСКЕВІЧ з яе 23-ма навуковымі публікацыямі па турызме, 20-цю дакладамі на навуковых канферэнцыях, унушальным стосам грамат і грантаў студэнтаў і аспірантаў БДУ за 2008 год; а таксама магістрант ФРіЭ Уладзіслаў БЯЛЯЎСКІ (у яго 30 публікацый пра паўправадніковыя лазеры, больш за 20 дакладаў, тры гранты БДУ і грант Мінадукацыі). Абодва, дарэчы, стыпендыяты спецфонду прэзідэнта краіны па падтрымцы адоранай моладзі;

*“спартоўцы”* – бронзавы прызёр XXIX Алімпійскіх гульняў, чэмпіён Беларусі 2008 года па грэка-рымскай барацьбе, заслужаны майстар спорту Міхаіл СЯМЁНАЎ, студэнт IV курса гістфака; а таксама будучы біёлаг Аляксандр НАПЫЛАЎ, які не толькі здолеў стаць чэмпіёнам краіны па барацьбе самба сярод юніёраў і ўладальнікам бронзавых медалёў рэспубліканскіх універсіяд па самба і дзюдо, але і мае вельмі годны сярэдні бал залікоўкі (8,11);

*“лідары”* (грамадскія дзеячы) – Юлія СТОЦКАЯ, пяцікурсніца юрфака, вопытны арганізатар масавых забаў, удзельніца зборнай універсітэта па турысцка-прыкладным мнагабор’і, стараста, старшыня спартыўна-аздараўленчай камісіі прафбюро факультэта, выдатніца, між іншым; а таксама Дзмітрый МІКУЛКА, магістрант-географ, сакратар БРСМ БДУ, які неаднойчы гартаваў свой лідарскі характар на розных курсах і праграмах моладзевых актывістаў.

Працадаўцы мусяць заўважыць яшчэ адну пяцікурсніцу з юрфака, пераможцу ў намінацыі *“Культура”* Алену МАТУСЕВІЧ, якая адзначылася ў арганізацыі і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў, сярэдні бал мае 9,2, а яшчэ носіць званне “Багіня Феміда-2006”.

Цудоўныя перспектывы для далейшага прафесійнага жыцця засведчылі наступныя лаўрэаты, бадай, галоўнага студэнцкага конкурсу: Яўген Ярчак (магістрант фізфака), Дзяніс Марціновіч (V курс гістфака), Андрэй Скіба (III курс ФМА), Сяргей Хромаў (V курс юрфака), Дзяніс Адамчык (V курс хімфака), Галіна Круль (магістрант хімфака), Павел Зязюля (магістрант ФРіЭ), Мікалай Валовіч (V курс фізфака), Канстанцін Прыдыбайла (III курс гумфака), Юлія Хмялеўская (IV курс эканамфака), Арына Арцімовіч (V курс ФФСН), Аляксей Кашпей (V курс эканамфака), Таццяна Халадзінская (II курс журфака), Міхаіл Сёмаў (магістрант фізфака).

Любую кампанію ўпрыгожаць сабой гэтыя ініцыятыўныя, з высокай самаарганізацыяй і працаздольнасцю, маладыя людзі, калі тая здолее іх ініцыятыву і талент належна аплаціць ды наталіць апетыт да поспеху, распалены БДУ.

Дарэчы, перамога ў конкурсе “Студэнт года БДУ” – толькі першы этап у далейшым прызнанні: чатырох з сёлетніх пераможцаў (Дзмітрыя Мікулку, Міхаіла Сямёнава, Настассю Траскевіч і Алену Матусевіч) альма-матэр выпраўляе змагацца за прэміі Мінгарвыканкама.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА**

УШАНАВАННЕ

# ПАРАСТКІ НАВУКІ

***Рашэннем Вучонага савета БДУ вызначаны лаўрэаты конкурсу на найлепшыя навуковыя працы студэнтаў у галіне сацыяльных і гуманітарных, прыродазнаўчых і тэхнічных навук 2008 года.***

Імі сталі:

– у галіне *прыродазнаўчых і тэхнічных навук* – магістрант факультэта радыёфізікі і электронікі Уладзіслаў БЯЛЯЎСКІ – за працу “Распрацоўка лазерных дыёдаў на аснове GaInAsSb/AlGaAsSb гетэраструктур і асаблівасці іх выкарыстання ў прэцызійнай святлодальнаметрыі” (навуковы кіраўнік – кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Іван Манак);

– у галіне *сацыяльных і гуманітарных навук* – студэнт V курса гістарычнага факультэта Вадзім УРУБЛЕЎСКІ – за працу “Крыніцы сялянскай генеалогіі канца XVIII - пач. XX стст. па матэрыялах НДАБ (на прыкладзе маёнтка Целякова Ігуменскага павета Мінскай губерні)” (навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Дзмітрый Яцкевіч).

Пераможцам конкурсу прысвоена званне “Лаўрэат прэміі БДУ за найлепшую навуковую працу студэнтаў”, яны ўзнагароджаны дыпломамі і прэміямі ў памеры 20 % прэмій імя А. Сеўчанкі і У. Пічэты.

Прэміямі ў памеры службовага акладу заахвочаная і навуковыя кіраўнікі маладых талентаў.

Акрамя таго, за паспяховы ўдзел у конкурсе ўзнагароджаныя граматамі і прэміямі ў памеры трох базавых велічынь: выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Максім Васькоўскі, студэнтка магістратуры біялагічнага факультэта Таццяна Матвейчык, магістрантка кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі Аляксандра Лукіна і студэнтка V курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук Ганна Шыраканава.

**Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН**

ВІКТАРЫНА

# ПАПАРАЦЬ-КВЕТКА ЗАЦВІТАЕ ДЛЯ ЦЯБЕ

***Названы пераможцы віктарыны на веданне гісторыі асветы, навукі, культуры нашай краіны і Белдзяржуніверсітэта, прымеркаванай да Дня нараджэння альма-матэр. Заданні былі надрукаваныя ў газеце “Універсітэт” ад 23 верасня.***



На 55 пытанняў розных узроўняў пра універсітэты свету, гісторыю БДУ, універсітэцкі гарадок паступіла 220 адказаў ад студэнтаў філалагічнага, гістарычнага, гуманітарнага, эканамічнага факультэтаў, а таксама ФФСН, факультэта міжнародных адносін і Інстытута журналістыкі.

Пераможцамі сталі (з наданнем адпаведных умовам конкурсу грашовых прэмій):

дыплом I ступені атрымаў студэнт II курса гуманітарнага факультэта *Эдгар Бабічаў;*

дыплом II ступені прысуджаны *Анастасіі Мігно*, студэнтцы I курса філалагічнага факультэта;

трэцяе месца выпала магістрантцы фізічнага факультэта *Алене Мічалёвай.*

Падзякі з заахвочвальнымі прэміямі атрымалі студэнткі Інстытута журналістыкі Алеся Саўчук і Вольга Навумчык, якія заданні віктарыны выконвалі разам; студэнт гістфака Глеб Сандрас; студэнтка V курса ФМА Ірына Лішык.

Рэктар БДУ прафесар Сяргей Абламейка асабіста ганараваў лаўрэатаў на вечары, прысвечаным Дню студэнта, і падзякаваў усім удзельнікам за стараннае і дапытлівасць розуму. На прыгожа аздобленых дыпломах эпіграфам стаяць словы Кірылы Тураўскага “Сладко медвены сот і добро сахар, обоего же добрее кніжны разум: сія убо суть сокровіща вечныя жызні”.

Яшчэ для 27 удзельнікаў віктарыны ад упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю накіраваны просьбы да дэканаў факультэтаў заахвоціць іх прэміямі па выніках квартала.

“Вялікі дзякуй. Рашаючы віктарыну, даведалася шмат цікавай інфармацыі пра універсітэты свету і гісторыю БДУ. Гэта вельмі важна для першакурсніка. Галоўная ўзнагарода – гэта тыя веды, якія атрымала, пакуль знаходзіла адказы на пытанні. Сапраўды, папараць-кветка зацвіла для мяне ў БДУ! Спадзяюся, што тая “сума” (назва выніковай работы студэнтаў сярэднявечных універсітэтаў – *Рэд.*) ведаў, якую я знайду падчас навучання, будзе карысная не толькі для мяне, але і для маіх знаёмых”, – такую прыпіску ў канцы сваіх адказаў зрабіла студэнтка I курса філфака Вольга Глоба.

А мы ўдакладнім: веды тыя будуць карыснымі і для сябе, і для БДУ, і для дзяржавы. Поспехаў усім удзельнікам. Імпэту ў працы.

**дацэнт Уладзімір НАВУМОВІЧ,**
**аўтар праекта**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# Раскадзіравалі Google

**Выпускнікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Іван Мяцельскі і Аляксей Тоўсцікаў займелі поспех на фінальных спаборніцтвах па праграмаванні Google Code Jam-2008, якія прайшлі 14 лістапада ў галоўным офісе фірмы Google (Mountain View, Каліфорнія, ЗША).**

Нашы хлопцы ў чарговы раз пацвердзілі сусветны ўзровень падрыхтоўкі па праграмаванні, заняўшы, адпаведна, 8 і 13 месца ў асабістым заліку, апярэдзіўшы, да прыкладу, расіян, найлепшы з якіх заняў 15 месца.

У гэтых спаборніцтвах могуць прымаць удзел праграмісты ўсіх краін свету незалежна ад іх адукацыі, статусу і вопыту. Пасля адборачных спаборніцтваў, якія праходзілі ў некалькі этапаў, у фінал выйшлі 100 удзельнікаў. Найбольш прадстаўнікоў мелі: Расія (20), Кітай (19), ЗША (15). Ад Беларусі выступалі толькі два ўдзельнікі.

**Аляксандр КРАСЬКО**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв’ю з дырэктарам Інстытута непарыўнай адукацыі БДУ Валянцінай Дыніч** – “Рэспубліка” (21.11).

**Пра сям’ю мнагадзетнай маці-студэнткі БДУ Алены Сушко** – “Чырвоная змена”/”Звязда” (21.11).

**Поспех на фінальных спаборніцтвах GoogleCodeJam-2008 выпускнікоў ФПМІ БДУ Івана Мяцельскага і Аляксея Тоўсцікава** – “Советская Белоруссия” (18.11); БелТА (18.11); БелаПАН (18.11); open.by (18.11); tut.by (18.11); naviny.by (18.11); “Настаўніцкая газета” (22.11).

**Інтэрв’ю з дэканам біялагічнага факультэта Уладзімірам Лысаком** – “Настаўніцкая газета” (18.11).

**Дзейнасць псіхалагічнай службы БДУ** – “Настаўніцкая газета” (18.11).

**Да 82-й гадавіны ваеннага факультэта БДУ** – “Во славу Родины” (15.11).

**“Капуснік-2008 БДУ”** – naviny.by (14.11).

**Міжнародны фестываль “Тэатральны куфар” БДУ** – “ЛіМ” (14.11).

**Курсы павышэння кваліфікацыі журналісцкіх кадраў Інстытута журналістыкі БДУ** – “Настаўніцкая газета” (13.11).

**Юбілей фізічнага факультэта** – “Минский курьер” (13.11); “Настаўніцкая газета” (18.11).

**Міжнародны праект “Koufar-to-stage”** – БелТА (12.11); БелаПАН (15.11); open.by (15.11).

**Студэнцкія сталовыя, у тым ліку ў Інстытуце журналістыкі БДУ,** – “Минский курьер” (12.11).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# СВЕЖАНЬКАЯ КАПУСТА

***Ёсць вельмі просты рэцэпт падоўжыць сабе жыццё. Не, не, медычныя таямніцы тут ні прычым. Проста пацыенту трэба было схадзіць на "Капуснік-2008", які прайшоў 14 лістапада ў зале Ліцэя БДУ. Дэпрэсія, хандра і іншыя непарадкі – усё гэта як рукой зняло. Аказваецца, нашы студэнты-першакурснікі ведаюць лепшыя рэцэпты ўзняць настрой. Паспрабуем?***



*Каманда геафака з заваяваным кубкам*

Капуснік-2008" на пераходны "Кубак рэктара БДУ" праводзіцца ўсяго толькі ў другі раз. Але, нягледзячы на гэта, прафесіяналізм у арганізацыі мерапрыемства – на найвышэйшым узроўні. Студсаюз пастараўся!

Сёлета ў самым маштабным, вясёлым і крэатыўным свяце смеху прынялі ўдзел 16 камандаў факультэтаў, што на парадак больш, чым летась.

Інстытут журналістыкі паказаў Максіма Мірнага і яркі масавы танец. Эканамічны факультэт здзівіў адсутнасцю ў камандзе дзяўчат. Няўжо гэта наступства сусветнага фінансавага крызісу? Радыёфізікі ў фінале праспявалі прыгожую песню на чале з зоркай-пачаткоўцам – Дэвідам. Філалагічны факультэт вырашыў не ўжываць плоскіх або смаленых жартаў, і таму іх казырным нумарам былі танцы. ФФСН вярнуўся ў мінулае, і нездарма... Біялагічны факультэт – цяперашнія наватары. У іх камандзе было ўсяго 2 чалавекі, але добра гэта або дрэнна, вы даведаецеся ў канцы матэрыялу. Мехмат, яны ж "хлопцы ў клетачку", падавалася, зноў пераможа.

Пакуль журы раілася, адбылося ўзнагароджанне пераможцаў і лаўрэатаў фотаконкурсу "БДУ ў маім фармаце". Шчаслівчыкі атрымалі грашовыя прэміі. Але і гэта яшчэ не ўсё! Абвешчаныя вынікі віктарыны "Папараць-кветка зацвітае для цябе ў БДУ", апублікаванай у газеце "Універсітэт". Хто не паленаваўся паварушыць мазгамі – выйграў прэмію. А зараз – самае галоўнае!

3-е месца на "Капусніку-2008" занялі:
Механіка-матэматычны факультэт
Эканамічны факультэт
Біялагічны факультэт
2-е месца падзялілі паміж сабой
ФФСН і ФПМІ
А самымі лепшымі сталі ГЕОГРАФЫ.
*Віншуем!*

**Насця ПЯТРОВІЧ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# ВУЧЫМСЯ БЫЦЬ КРАЯЗНАЎЦАМІ

**Краязнаўцамі не нараджаюцца. Краязнаўцамі – становяцца.**

Зразумела, без любові да родных мясцін добрым знаўцам, даследчыкам іх гісторыі, культуры, прыроды не станеш. Але ж толькі тады, калі гэта пачуццё будзе апладнена глыбокімі ведамі пра людзей і падзеі, што звязаны з тым ці іншым краем, яго мову, вусную народную творчасць, навакольны свет і г. д., – толькі тады ты зможаш узбагаціць духоўна і сябе, і іншых. Адным словам, стаць сапраўдным краязнаўцам.



*Прафесар В. Рагойша са сваімі студэнтамі*

Менавіта так меркавалі супрацоўнікі кафедры тэорыі літаратуры, калі восем гадоў таму прапанавалі студэнтам факультатыў "Прыкладное літаратуразнаўства", а ў ім, сярод асобных прадметаў трохгадовага цыклу, – 18-гадзінны курс "Літаратурнае краязнаўства". Вядома, што найперш маладым настаўнікам-філолагам у школах, як правіла, прапануюць весці краязнаўчыя гурткі. Але дзе ж уведаць пра навукова-метадычныя асаблівасці краязнаўчай працы? Дзе пачуць ці прачытаць пра яе? На жаль, у айчынных ВНУ курс краязнаўства не выкладаецца...

"Прыкладное літаратуразнаўства" разлічана не толькі на адукацыйнае ўзбагачэнне будучых настаўнікаў, але і на пашырэнне іх магчымасцяў у сферы іншай філалагічнай працы. Таму, безумоўна, толькі літаратурай яно не абмяжоўваецца. Тут і тэксталогія, архівазнаўства і археаграфія, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства і выдавецкая справа, крыніцазнаўства і музеязнаўства, літаратурнае рэдагаванне і карэктура, тэорыя і практыка літаратурна-мастацкай крытыкі... Усё гэта – з філалагічным, найперш літаратуразнаўчым, ухілам. Чытаюць асобныя прадметы такія вопытныя спецыялісты, як дацэнты М. Кенька, П. Ткачова, старшы выкладчык І. Ківель, выкладчыца С. Шамякіна, а таксама аўтар гэтага допісу.

Любая навука мае сэнс толькі тады, калі яна ўвасабляецца ў жыццёвую практыку. Філфак БДУ можа пахваліцца тым, што яго выпускнікі запатрабаваныя не толькі ў сферы школьнага навучання. Сярод супрацоўнікаў і нават кіраўнікоў амаль усіх літаратурных музеяў краіны, Дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Беларусі, асобных раённых краязнаўчых музеяў, аддзелаў рэдкіх кніг і рукапісаў найбуйнейшых бібліятэк – нашы былыя студэнты, у тым ліку тыя, што прайшлі згаданы факультатыў.

Нядаўна была прапанавана яшчэ адна форма практычнай літаратурна-краязнаўчай працы, ініцыятарам якой стаў вядомы вучоны і пісьменнік, доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс. Пад яго кіраўніцтвам ужо каторы год вядзецца работа па стварэнні краязнаўчага даведніка "Літаратурныя мясціны Беларусі". Дайшла чарга і да сталіцы. Работы тут – процьма. Неабходна зафіксаваць і вуліцы з імёнамі пісьменнікаў, і розныя мемарыяльныя знакі, прысвечаныя літаратарам, і ўстановы, названыя ў іх гонар. Трэба выявіць і ўлічыць, хто з творцаў прыгожага пісьменства і на якіх могілках знайшоў вечны спачын... З усім, зразумела, аднаму-двум чалавекам не справіцца.

І вось Адам Восіпавіч завітаў на родны яму факультэт, дзе звярнуўся да студэнтаў спецыяльнасці "Беларуская філалогія", якія з радасцю згадзіліся дапамагчы вучонаму. Неўзабаве некалькі студэнцкіх брыгад адпраўляцца на пошукі запаветных літаратурных мясцін беларускай сталіцы. Магчыма, што ў выніку гэтых вандровак, апрача непасрэднай дапамогі ў стварэнні літаратурнай біяграфіі Мінска, удасканаляцца надпісы на некаторых вулічных шыльдах (з беларускімі надпісамі ў нас часам проста бяда), з'явяцца на пачатку вуліц паведамленні пра пісьменнікаў, імёнамі якіх уганараваны гэтыя вуліцы, добраўпарадкуюцца магілы некаторых забытых пісьменнікаў...

Краязнаўцы – сапраўдныя патрыёты сваёй Бацькаўшчыны.

**прафесар Вячаслаў РАГОЙША**

УСТАНОВЫ

# ПАВЫСІЦЬ ЯКАСЦЬ ТЭЛЕПРАДУКТА

***З верасня ў складзе Інстытута журналістыкі пачаў дзейнасць факультэт павышэння кваліфікацыі журналісцкіх кадраў, які дагэтуль зладзіў шэраг курсаў. Бадай, самай знакавай падзеяй стала перападрыхтоўка спецыялістаў рэгіянальных тэлекампаній Беларусі, чаму зараз надаецца вялікая ўвага на дзяржаўным узроўні.***



*Арганізатары курсаў: С. Дубовік, Г. Басава, В. Бардзіян*

У новых умовах з 21 па 31 кастрычніка павышалі кваліфікацыю прадстаўнікі аўдыёвізуальных СМІ з такіх гарадоў, як Лепель, Ліда, Салігорск, Жодзіна, Маладзечна, Паставы, Наваполацк і інш. На адкрыцці курсаў выступілі першы намеснік міністра інфармацыі Аляксандр Слабадчук і начальнік упраўлення электронных СМІ Мініфармацыі Генадзь Курбека.

Слухачы пазнаёміліся з кіраўніцтвам Інстытута журналістыкі, з яго выкладчыкамі, а таксама з вядучымі прадстаўнікамі аўдыёвізуальных СМІ нашай краіны. Да таго ж, да курсаў спрычыніліся супрацоўнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Падчас лекцыйных заняткаў, тэматычных дыскусій, майстар-класаў і круглых сталоў абмяркоўваліся неабходныя з тэарэтычнага і практычнага погляду пытанні: развіццё сучаснай аўдыёвізуальнай прасторы краіны, персанальная камунікацыя ў міжнародных зносінах, моўны густ эпохі, удасканаленне рэгіянальнага тэлебачання, асноўныя патрабаванні да журналістыкі рэгіянальных СМІ, традыцыйныя СМІ ў Інтэрнэце, тэхніка-псіхалагічныя асаблівасці тэлеінтэрв'ю, вобраз вядучага тэлебачання, мова на тэлеэкране, аўтарскае права і сумежныя правы, прававое рэгуляванне годнасці і дзелавой рэпутацыі, этыка журналіста.

Асаблівую зацікаўленасць выклікаў круглы стол "Актуальныя пытанні развіцця рэгіянальнага тэлебачання", які вёў загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі дацэнт Вячаслаў Булацкі. Вячаслаў Рыгоравіч заўважыў, што рэгіянальнае вяшчанне мае найбольшую ступень свабоды ў выбары тэм для інфармацыйных сюжэтаў у адрозненне ад абласнога вяшчання, якое вымушана працаваць ужо з глабальным інфармацыйным прадуктам.

Намеснік начальніка ўпраўлення электронных СМІ Міністэрства інфармацыі Беларусі Ніна Раеўская засяродзіла ўвагу на якасці тэлепрадукта. Рэгіянальным тэлежурналістам неабходна павышаць сваё прафесійнае майстэрства, а тэлекампаніям трэба павялічваць асабісты тэлепрадукт, абавязкова друкаваць праграмы перадач, захоўваць маральныя і аўтарскія правы, а таксама мець на ўвазе перспектыву пераходу на лічбавае вяшчанне.

Падчас дыскусіі абмяркоўвалася сітуацыя з журналісцкімі кадрамі ў рэгіянальных СМІ. Выявілася, што калегам не хапае прававых ведаў, а таксама вопыту работы на базе пэўнай рэгіянальнай тэлекампаніі. Яны звярнуліся да арганізатараў з прапановай праводзіць выязныя семінары і майстар-класы з удзелам вядучых спецыялістаў аўдыёвізуальных СМІ.

Вельмі карысным быў майстар-клас галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі продажу і маркетынгу Белтэлерадыёкампаніі Андрэя Макаеда. Ён расказаў пра асноўныя аспекты карпаратыўнай палітыкі, якая павінна абапірацца на сацыялагічныя даследаванні, што адлюстроўваюць запыт тэлегледачоў, іх цікавасць да канкрэтнай перадачы ці тэлеканала. Гэта спрыяе выяўленню розных рэйтынгавых адзнак сістэмы вяшчання. Замацаванню атрыманых ведаў паслужылі выязныя заняткі на ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне", якія праводзіў кіраўнік дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання СТБ Ігар Пазняк.

Напрыканцы ўсе слухачы атрымалі пасведчанні факультэта павышэння кваліфікацыі журналісцкіх кадраў з рук дэкана Ганны Басавай і дырэктара Інстытута журналістыкі Сяргея Дубовіка.

**Аксана БАРЫСЕВІЧ**

# МІС БДУ-2008

**8 снежня ў 19.00 на сцэне канцэртнай залы "Мінск"** пачнецца захапляльнае дзейства – свята маладосці, прыгажосці, грацыі, інтэлекту і таленту – шоу-конкурс "Міс БДУ".

На сцэну выйдуць чароўныя дзяўчаты – найлепшыя прадстаўніцы факультэтаў і інстытутаў альма-матэр. "Міс БДУ" – гэта не звычайны "глянцавы" конкурс прыгажосці, яго ўдзельніцы пакажуць не толькі сябе, але і сваё навучальнае падраздзяленне. Вялікае значэнне мае творчы аспект, камунікабельнасць, крэатыўнасць, сацыяльна актыўная пазіцыя.



Арганізатары мерапрыемства – Студэнцкі Саюз БДУ, упраўленне па справах культуры і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю. На свята завітаюць прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры, грамадскія дзеячы, зоркі беларускай эстрады і іншыя вядомыя асобы.

Дзяўчат чакае некалькі выпрабаванняў:

– *Візітная картка* (самапрэзентацыя) – жыццё, падзеі, густы, схільнасці, светаадчуванне, мэты і жаданні, мары і планы;

– *Дзелавы конкурс*:

– Дэфіле ў дзелавым касцюме, прадстаўленым швейным прадпрыемствам "Нелва",

– Інтэрв'ю;

– *Дэфіле ў купальніку*, прадстаўленым кампаніяй "Мілавіца";

– *Творчы конкурс* – нумар у любым жанры: танец, ілюзіён, клаунада, драматычнае або камічнае выступленне, балет, пластыка ці пантаміма, эпісталярная творчасць, ігра на музычным інструменце або кампазітарскія здольнасці ў выкананні аўтара, вакал, спартыўны нумар, дызайнерскія таленты з дэманстрацыяй сваёй "мадэлі";

– *Дэфіле ў вячэрнім строі*, прадстаўленым салонам вясельнай і вячэрняй вопраткі "Утаймаванне наравістай".

У журы будуць кіраўнікі Белдзяржуніверсітэта, дзеячы культуры і мастацтва – людзі, здольныя прафесійна і аб'ектыўна ацаніць здольнасці ўдзельніц.

Вышэйшая адукацыя – аснова для пабудовы сучаснага прагрэсіўнага грамадства. Мы выступаем за творчую актыўнасць маладых людзей, імкненне да нестандартнага мыслення, а таксама за здаровы лад жыцця як абавязковую ўмову развіцця асобы.

Маладосць, талент, адукацыя – тры базавыя тэрміны, якія ярка характарызуюць канцэпцыю конкурсу "Міс БДУ".

**Аргкамітэт**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

25 лістапада 2008 года
Падпісана да друку 26.11.2008 г.
Зак.1318. Тыраж 2000 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by